# ПРЭЗІДЭНТ СУСТРЭЎСЯ З ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ

***Як паведамілі з прэс-службы Прэзідэнта, 12 жніўня 1998 года А.Р.Лукашэнка прыняў з дакладам прэм'ер-міністра С.С.Лінга.***

На сустрэчы разглядаліся пытанні падрыхтоўкі да работы ў асенне-зімовы перыяд. Прэзідэнт даручыў ураду пад адказнасць прэм'ер-міністра вырашаць усе праблемы, звязаныя з падрыхтоўкай да зімы.

С.С.Лінг таксама праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб ходзе сельскагаспадарчых работ. А.Р.Лукашэнка ўказаў на нізкія тэмпы ўборкі збожжавых і звярнуў увагу ўрада на нездавальняючы ход продажу збожжа дзяржаве і асабліва харчовай пшаніцы. Прэзідэнт падкрэсліў, што пытанні харчовай бяспекі павінны быць у цэнтры ўвагі выканаўчых органаў улады і вырашацца сумеснымі намаганнямі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, рай- і аблвыканкамаў. А.Р.Лукашэнка таксама звярнуў увагу на недастатковую работу па арганізацыі шэфскай дапамогі з боку гарадоў, буйных прадпрыемстваў і ўказаў на неабходнасць выпрацоўкі сістэмы замацавання і падтрымкі вёскі з боку гараджан.

С.С.Лінг далажыў кіраўніку дзяржавы аб мерах, што прымаюцца па ліквідацыі вынікаў неспрыяльных умоў надвор'я ў рэспубліцы ў чэрвені-жніўні бягучага года. Прэзідэнт падтрымаў дзеянні ўрада па гэтых пытаннях і падкрэсліў неабходнасць першараднай дапамогі насельніцтву пацярпелых раёнаў.

Прэм'ер-міністр таксама далажыў кіраўніку дзяржавы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і ўдакладненні яго параметраў да канца 1998 года.